№ 71 Ausgabe B.

ГОМАН

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Цэна с перасылкай і дастаукай да хаты:
на 1 год—10 м. 80 фэн., на ½ году—5 м. 40 ф., на 3 месяцы—2 м. 70 ф., на 1 мес.—90 фэн.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:
на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі—25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці—60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 71 (267). Год III. Вільня, 10 вэрасьня 1918 г. Цэна 10 фэн. (5 кап.)

9 верасьня.

Заходні тэатр.

На поўначы ад Армант'ер ворагі зрабілі наступленьне, але былі адбіты, утраціўшы палонных. На паўдня ад дарогі Пэррон—Камбрэ ворагі далей штурмавалі вялікімі сіламі. Яны адбіты с цяжкімі стратамі ў ворагаў. Між Айет і Эн ворагі ў вечары павялі концэнтрованую атаку. Яны крывава адкінуты на ўсенькім фронце.

Англіцкая лятучая эскадра, атакаваўшая Маннгэйм, утраціла 5 самалётаў.

У жніўні мы зьбілі 565 самалётаў і 53 прывязныя шары.

ВЕНА (В.Т.Б.) 8.IX. „N. Fr. Presse“ пад загалоўкам «Разброеньне і угадлівы суд» друкуе доўгую доўгую стацьцю б. міністра заграніўных спраў, гр. Чэрніна, ў каторай паміж іншым гаворыцца: «Прамова статс-сэкрэтара Сольфа паказвае, што і ў бэрлінскіх кіраўнічых кругах узмацоўваецца думка, што гэта сусьветная вайна завядзе новы лад на сьвеце і што забаспечаньня ад новых войн у будучыні трэба шукаць не ў павялічываньні аружных сіл, а ў міжнародных умовах. Страх Англіі перад будучай вайной з узмацаванай Нямеччынай—гэта спосаб, каторым Льлёйд Джордж гоніць свой народ да далейшае вайны. Гэтае недаразуменьне паддзержывае вайну. якая будзе трываць далей, пакуль яно істнуе“.

Граф Чэрнін далей кажа, што раз кіраўнічыя кругі ў Бэрліне дзержацца памянутай думкі і раз міністэр гр. Бур'ян не выступае проці яе,—дык няма пражкод дзеля таго, каб цэнтральныя дзяржавы апрацавалі асновы гэткага новага сусьветнага ладу і падалі іх усяму сьвету.

РОТТЭРДАМ. Рузэвэльт у часе сьвята ў памяць Ляфайета сказаў прамову, кажучы паміж іншым: „Нямецкіх колоній нельга аддаваць назад. Нямеччына павінна вярнуць усе зробленыя шкоды. Сэрбія і Румынія адбудоўваюцца ў сваіх старых межах. Аўстрыя і Турэччына будуць падзелены, і ўсе падвласныя ім народы будуць вызволены. Незалежная Польшча павінна абняць польскія землі Аўстрыі, Нямеччыны і Расеі, маючы узьбярэжжа Балтыцкага мора. Літва, Ліфляндыя і Эстляндыя атрымаюць забаспечаньне іх свабоды. Армэнія вызваляецца. Палестына становіцца жыдоўскай дзяржавай“.

АМСТЭРДАМ (В.Т.В.). 8.IX. Інтрыгі саюзьнікаў у Расеі паказваюць усяму сьвету, якую цану маюць іх пекныя словы аб волі і самаазначаньні, каторыя становяць кліч саюзнікаў пры іх безмілясэрнай ваеннай палітыцэ. Яны бязупынна заяўлялі, што трэба адбудаваць дзяржаўны лад вялікай імперыі, але цяпер і гэта маска сарвана з твару саюзьнікаў. Выкрытая змова проці панаваньня большэвікоў ясна паказвае, што Англія і Францыя не задзержацца больш ні перад чым, каб правясьці свае пляны ў Расеі. Што скажуць на гэта социялісты і дэмакраты ў саюзьніцкіх старонах? Меньшэвікі ў Францыі адкрыта заявілі, што выступленьне проці Расеі — гэта праступак. Соцыялістычны клюбе у італьянскім парлямэнце у нядаўна прынятай рэзалюцыі заявіў, што аружнае выступленьне ў расейскіх справах рэзка цярэчыць аслаўленым заявам аб праве і свабодзе народаў. Пролетары ўсіх краёў павінны паруціцца аб згоду тэорыі і практыкі.

ШТОКГОЛЬМ (В.Т.Б.). 8.IX. Уцёкшый учора з Расеі амэрыканец пацьвярджае вестку аб арышце членаў англіцкага пасольства.

ТОКІО (Рэўтэр). 7.IX. Японцы ў сваім руху на Краснаярск не сустрэцілі ворагаў. У Владывасток прыехаў англіцкі гэнэрал Нокс. Адступленьне чэха-славакоў адбылося з прычыны прыходу чысьленага большэвіцкага войска з Байкалу на Хабаровск.

КІЕУ ((В.Т.Б). 7.IX. Міністэр-прэзыдэнт Лізагуб сказаў прадстаўнікам нямецкіх газэт, што мэта яго падарожы ў Бэрлін—гэта прадлажэньне нямецкаму ўраду узяць на сябе пасрэдніцтва, каб прысьпешыць канец расейска-украінскіх перагавораў. Нямеччына згодзілася на гэта.

В.Т.Б. даведываецца з веры годных крыніц, што расейцы асабліва жадаюць прысьпешыць мірныя перагаворы з Украінай.

БЭРЛІН. Да 16 жніўня з Украіны ў Нямеччыну прывезьлі 2.181 вагон жыта, 4,429 вагонаў іншае ядоміны і 905 вагонаў сыр'я.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 8.IX. Украінскі гэтман сягоньня раніцай выехаў са сьвітай у вялікую глаўную кватэру адведаць гэн.-фэльдм. ф. Гіндэнбурга і гэнэрала Людэндорфа.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 8.IX. Англіцкае адміралцейства наказые, што дзеля пацьверджаньня заявы Льлёйда Джорджа аб зьніштажэньні ў часе вайны 150 нямецкіх падводных лодак яно друкуе спіс 150 пагібшых і палонных камэндантаў нямецкіх падводных лодак.

В. Т. Б. з гэтай прычыны заяўляе, што число новабудаваных нямецкіх падводных лодак у кожын мамэнт больш за чысло затопленых.

ШТУТГАРД (В.Т.Б). 8.IX. Тутэйшыя апараты адзначылі 7 верасьня каля поўначы вельмі сільнае трасеньне зямлі ў 10.000 кіл.

Беларускія Вучыцельскія курсы у Сьвіслачы.

Ад 15 кастрычніка 1918 г. да 15 жніўня 1919 г. ў Беларускай Сэмінарыі ў Сьвіслачы будзе адбывацца новы элемэнтарны курс для беларускіх вучыцялёў і вучыцеляк.

Адпаведныя кандыдаты і кандыдаткі ад 18 да 30 гадоў могуць заяўляцца ў сваіх крэйсамтах; мясцовые—проста ў кіраўніка курсамі, інспэктара Бэндзехі, у Сьвіслачы. Там-жа яны даведаюцца аб варунках прыёму.

Вільня, 10 верасьня 1918.

У часе перагавораў між дэлегацыямі савецкай Расеі і Украіны ў Кіеве галава расейскай дэлегацыі, Ракоўскій, заявіў, што ён — прадстаўнік усяго абшару Расейскага гасударства, да каторага належаць і Дозшчына, і Сібір, і Крым, *і Беларусь*.

Як бачым, большэвіцкі ўрад зусім ня зьбіраецца выракацца сваіх правоў на Беларусь, вынікаючых с факту *захвату* нашае зямлі больш за сто гадоў таму назад самадзяржаўным расейскім гасударствам. І ясна, як Божы дзень, што большэвікі пры гэтым становяцца акурат на тое становішча, на якім стаяць гэтак паганьбеныя імі *імпэрыялісты*. Ясна такжа, што гэткае становішча калоціцца і з вядомым ужо фактам самаазначаньня Беларусі пастановай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з 25 марца 1918 г., на каторы беларусы будуць заўсёды пазывацца, як на выразна выяўленую волю нашага народу.

Але не аб гэтым хочам мы тут гаварыць. Справа ня ў тым, чаго ад нас хоча ці ня хоча Расея, а ў тым, чаго хочам мы самі. І раз воля народу беларускага ўжо вядома, дык *акт 25 марца* і будзе для нас служыць пуцяводнай зоркай у нашай далейшай працы.

Перш за ўсё,—перш, чым скажуць аб нашай незалежнасьці сваё слова вялікія дзяржавы,—мы павінны правясьці прынцып незалежнасьці ў нашым унутраным жыцьці. Гэта значыць: мы павінны выкарыстаць гэты час окупацыі дзеля таго, каб наладзіць сваё жыцьцё ў межах *Белорускай дзяржавы* так, як таго вымагаюць нашыя нацыянальныя інтарэсы, інтарэсы многамільённых мас нашага працоўнага народу. Цэнтральны орган уласьці мы ўжо маем: гэта—Народны Секрэтарыат Беларусі, наш беларускі ўрад. Але перад намі стаіць яшчэ вялізарная і цяжкая работа: гэта—прытарнаваньне старых урадовых установ, наладжаных яшчэ маскалямі, да вымог Беларускага гасударства,—іначэй кажучы, *абеларушчаньне* іх.

Першыя крокі ўжо зроблены. Ужо йдзе работа над нацыяналізацыей школ, ужо беларускі ўрад бярэ ў свае рукі эканамічныя справы нашага краю. Але сьледам за гэтым трэба прыступаць і да далейшых задач: да абеларушчаньня ўсяе адміністрацыі, судоў і інш.

Мы ведаем, што задача гэта — ня лёгкая: прыходзіцца разьбіваць устаноўленыя за сто з лішкам гадоў маскоўскае нявολі традыцыі, ваяваць з вялікімі перасудамі, асновамымі на ўтраце нашай інтэлігэнцыей нацыянальнай сьвядомасьці. Але ад тэй ці іншай разьвязкі гэтага пытаньня залежыць уся наша будучына: сваю незалежную дзяржаву Беларускі народ можа збудаваць *толькі на нацыянальнай аснове*,—уся-ж работа без нацыянальнага фундамэнту пры больш дужым націску Маскоўшчыны можа быць лёгка зьніштожана.

Дадатковая умова між Нямеччынай і Расеей.

I разьдзел.

Артыкул. 1. На ўсіх расейска-нямецкіх фронтах арганізуюцца нямецка-расейскія камісіі дзеля устанаўленьня дэмаркацыйнай лініі і нэутральнага пояса. Варункі зносін цераз нэутральную лінію устанаўлівае дэмаркацыйная камісія.

Арт. 2. Пасьля акуратнага правядзеньня падробнай усходняй граніцы Ліфляндыі і Эстляндыі нямецкія войскі ўраз-жа ачысьцяць землі на ўсходзе ад гэнай лініі.

Арт. 3. Нямеччына вывядзе свае войскі яшчэ перад агульным мірам з занятых зямель на ўсходзе ад Бярэзіны—ў меру выплаты таварамі грашавых павіннасьцей, прынятых на сябе Расеей. Падробныя варункі ачысткі, а такжа ўстанаўленьня ў кожным прыпадку пакіданых участкаў вызначае памянутая камісія. Умаўляючыся староны пакідаюць сабе права зрабіць умову аб вывадзе нямецкіх войск з зямель на заходзе ад Бярэзіны—ў меру выпаўненьня другіх прынятых на сябе Расеей абавязкаў.

Разьдзел II.

Арт. 4. Нямеччына ні ў якім здарэньні ня будзе мяшацца ў адносіны між Расейскай дзяржавай і прыналежнымі ей землямі, значыць, ня будзе вымагаць ані пад-

дзержываць незалежных гасударственых арганізацый на гэтых землях.

Арт. 7. Расея выракаецца дзяржаўных правоў на Эстляндыю і Ліфляндыю і ня будзе мяшацца ў іх унутраныя справы. Іх будучына будзе устроена у згодзе з насяленьнем.

Арт. 8. § 1. У Ліфляндыі, Эстляндыі, Курляндыі і Літве правоз тавараў з Расеі і ў Расею свабодны ад усялякага мыта.

§. 2 Тарыфы на чыгунках, якія зьвязываюць Расею з Рэвелем, Рыгаю і Віндаваю, не павінны мець характару мыта і не павінны быць вышэй таго, што патрэбна дзеля пакрыцьця коштаў утрыманьня і амортызацыі гэтых чыгунак.

§ 3. Водны рух на Дзьвіне павінен быць свабодны, пілнуючыся толькі канечне патрэбных паліцэйскіх правіл.

§ 4. Расея атрымае ў Рэвелі, Рызе і Віндаве участкі зямлі дзеля утварэньня «porto franco».

Арт. 10. Жыхаром быўшых расейскіх зямель даецца права выбару падданства і права павароту ў Бацькаўшчыну. Аб аддачы меньня жыхараў гэтых зямель і юрыдычных асоб (грамадзкіх арганізацый, устаноў і т. п.), якое знаходзіцца ў Расеі, між умаўляючыміся старонамі будзе зроблена асобная умова.

Рэформа правапісу.

Справа беларускага правапісу — гэта справа такая-ж старая, як і ўся сучасная пісаная літэратура адраджаючагася беларускага народу.

Беларускі рух пачынаці грамадзкія працаўнікі, палітыкі і г. п., але між імі ня было філёлёгаў. Дый не да таго тады ім было, калі трэба было адваёўваць для нашага народу права дыхаць жыць. Праўда, творцы нашай маладой літэратуры прабавалі ўстанавіць правілы правапісу, — ды ўсё гэта рабілася наміж іншым, мімаходам. З году ў год узьнімалася думка саззваць на зьезд усе чынныя беларускія літэратурныя сілы, каб устанавіць цьвёрдыя правілы пісьма, але нялічаныя пільныя справы, стаяўшыя на чародзе, адсоўвалі правядзеньне гэтага праекту ўсё надалей.

Болей-меней аднароднага правапісу дзяржаліся толькі працаўнікі беларускіх часопісей, — але раскіненыя па ўсёй Беларусі аўтары—літэратары і паэты—пісалі кожын на свой лад. Гэта было йшчэ нічога, пакуль справа йшла толькі аб літэратуру. Але цяпер, калі творыцца беларуская народная школа, беларуская гімназія, калі выдаюцца ўсе патрэбные для навукі кніжкі,— цяпер разнароднасьць правапісу ў розных школьных выданьнях вельмі дрэнна адбіваецца на навуцы дзяцей, і кожная кніжка, пісаная адменным спосабам, толькі баламуціць нашых школьнікаў.

Мы бачылі за час окупацыі нашага краю некалькі проб устанавіць асновы беларускага правапісу («Гоман», «Як правільна пісаць пабеларуску» А. Луцкевіча, «Беларускі правапіс» А. Луцкевіча і Я. Станкевіча, «Граматыка беларускай мовы» В. Пачобкі і інш.). Такія ж спробы былі зроблены і за ваенным кордонам («Вольная Беларусь» Язэпа Лёсіка „Думкі да граматыкі" Э. Будзькі). Усе яны шукалі тых асноў, на якіх можна было-бы збудаваць стройную сыстэму правіл беларускага пісьма. Апіраючыся на фонэтыцэ, ўсе стараліся пагадзіць яе з вымогамі этымолёгіі, паскольку бяз гэтага зацямняўся сэнс слоў.

Найбольш вострым было пытаньне аб «аканьні» безакцэнтных *о* і *е*. Аб аканьні *о* блізка ўсе зыходзіліся на тым, што яно бяз націску заўсёды пераходзіць у *а*, — толькі рабіліся выключэньні для канчаткаў (род ніякі дзеясловаў і родны склон адзін. ліку мужч. і ніягага роду прыметаў, калі націск не на канцы). Затое больш спорак вызывала вымова безакцэнтнага *е*. Тут адны «ікалі» (мянчукі, Б. Пачобка, Э. Будзька); другія акалі толькі *перад* націскам — і то толькі тады, калі ў складзе з націскам ня было *а* (А. Луцкевіч; трэйція акалі і *перад* і *пасьля* націску (Я. Станкевіч, праф. д-р Абіхт). А гэткая нязгодлівасьць вынікала з таго, што адны, добра знаючы жывую мову, ня мелі філёлёгічнай падгатоўкі, другія-ж, хоць і добрыя філёлёгі, ня зналі жывое мовы.

Цяпер справу аканьня можна лічыць разьвязанай, а жыцьцё нам пакажа, ці разьвязка гэная—ўдачная. Гэта—плод доўгіх досьледаў нашага земляка—філёлёга Б. Тарашкевіча, кандыдата філёлёгіі петрагр. унівэрсытэту, працаваўшага над беларускай мовай пад найбліжэйшым кірайніцтвам акадэміка А. Шахматова і пры ўчасьці акадэміка Я. Карскага. Праца Б. Тарашкевіча, абапертая на навуковых асновах, дае стройную, лёгка зразумелую і, бадай, найбольш правільную сыстэму „аканьня".

Перш за ўсё *о* бяз націску *акае заўсёды*, — ў тым ліку і ў канчатках. Што датыкае безакцэнтнага *е* (э), дык тут трэба ўважаць перш за ўсё на тое, ў якім складзе стаіць *е*: у цьвёрдым, ці мягкім. *У цьвёрдым складзе э бяз націску акае заўсёды—незалежна ад таго, ці стаіць перад націскам, ці пасьля яго.* Гэта і ёсьць навіна, якую ўводзіць п. Тарашкевіч. *У мягкім складзе е перад націскам акае у першых двох складох ад націску*, але, калі між складам з націскам і мягкім складам з *е* стаіць склад з *а*, дык гэнае *е* ня акае. *Пасьля націску* безакцэнтнае *е* ў мягкіх складох, наагул, *ня акае*, але п. Тарашкевіч, нарушаючы стройнасьць сыстэмы, акае ў канчатках множнага ліку ў прыметах (замяж добрые—добрыя, замяж старые—старыя) ва ўсіх трох родах.

Е зусім яўна чуваць толькі пад націскам. Ва ўсіх іншых здарэньнях, дзе стаіць *е* бяз націску, яго пры чытаньні можна вымаўляцца болей або меней блізка да *а*, часам да *і*. Вось-жа, каб было ясна, якое *е* трэба вымаўляць зусім яўна, а якое і так, і гэтак, над акцэнтаваным *е* заўсёды трэба ставіць знак націску (*é*).

У словах чужаземных, паскольку яны ўжываюцца рэдка і не ўкараніліся ў беларускай мове, *о* і *е* ня акаюць.

Фонэтыка зычных гукаў (сугалосных) у п. Тарашкевіча зусім згодліва з прынятай „Гоманам". Выключэньне становіць прыймя *з*, каторае перад глухім зычным пераходзіць у *с* толькі тады, калі зьлiваецца з чародным словам; калі-ж пішацца асобна, дык з не зьмяняецца.

Вось, усе тыя навіны, якія ўводзіць п. Тарашкевіч, раўнуючы да правапісу «Гомана». Мо' жыцьцё сёе-тое і зьменіць у іх, —але, агульна кажучы, яго правілы беларускага пісьма маюць за сабой павагу навукі, ды пры гэтым простыя і ясныя, што павінна аблягчыць правядзеньне іх у жыцьцё.

Разумеючы, якую вагу мае аднароднасьць правапісу ў беларускіх выданьнях, мы з гэтага нумэру ўводзім у «Гомане» сыстэму п. Тарашкевіча і прызываем усіх выдаўцоў і працаўнікоў на літэратурнай ніве дзяржацца гэтага-ж правапісу. Знаёмства з ім не вымагае асаблівай працы, а скоры выхад у сьвет «Беларускай Граматыкі для школ» Б. Тарашкевіча дасьць магчымасьць ня толькі школьнікам, але і ўсім беларусам датарнавацца да вымог беларускае навукі.

Там—і тут.

Хаця для беларускай культурнай працы ў межах старой окупацыі вытварыліся шмат лепшыя варункі, чымся за кордонам, — аднак, у аднэй справе мы далёка адсталі ад нашых закордонных братоў. Справа гэта безпасрэдна датыкаецца баларусаў-каталікоў, але разам з тым мае надта вялікую вагу для разьвіцьця беларускага руху агул.

Мы гаворым тут аб адносінах каталіцкага духавенства да беларускага пытаньня і да ходаньня беларусаў за свае нацыанальныя правы.

Там, за кордонам, дзе кіраўніцтва касьцельнымі справамі апынулася ў руках чалавека, каторы цьвёрда стаіць на шчыра каталіцкім грунце, беларусы сустрэцілі поўнае прызнаньне іх нацыанальных правоў. Мітрапаліт бар. Ропп, аб'яжджаючы касьцёлы магілёўскай дыэцэзіі, загадаў, каб быўшыя з ім ксяндзы ўсюды казалі казаньні пабеларуску. — Тут, у межах старой окупацыі, дзе вышэйшае каталіцкае духавенства бараніла і бароніць перш за ўсю справу Польшчы, адміністратары дыэцэзіі забараняюць ксяндзом прамаўляць з амбоны да народу ў нашай роднай мове.

Там, за кордонам, беларусы-ксяндзы маюць поўную свабоду працаваць для беларускай нацыянальнай справы — справы адраджэньня нашага народу: выдаюць беларускія газэты, маюць свой саюз, выдавецтва і т. п. — Тут, у нас, ксяндзоў-беларусаў гоняць у ссылку ў такія ваколіцы, дзе жыве небеларускі народ, а між беларусаў назначаюцца ксяндзы полонізатары...

Там ксяндзы-беларусы закладаюць беларускія школы і вучаць у іх дзяцей рэлігіі пабеларуску. — Тут адміністратар у сваіх акольніках дапускае адкрыцьце толькі польскіх або літоўскіх школ, а ў беларускіх школах ксяндзы адмаўляюцца вучыць каталіцкіх дзяцей асноў веры пабеларуску...

Гожа адзначыць, што такая-ж рожніца ў адносінах да беларусаў выяўляецца і ў абедзьвых часьцях Віленскай дыэцэзіі, каторую разьдзяліў ваенны фронт. Гэтак, на адбытым 6 і 7 жніўня 1918 г. дэканальным зьезьдзе ксяндзоў у Гэрманавічах, Дзісенскага павету (значыць, там, куды да апошняга часу не даходзіла ўласьць віленскіх адміністратараў), было пастаноўлена, што ў Дзісенскім дэканаце павінны быць адкрываны беларускія школы ў кожнай парахвіі з беларускай выкладовай мовай — пры поўнай школьнай аўтономіі для іншых нацыянальнасьцей. Але гэта пастанова была зроблена яшчэ ў тым часе, калі віленскі адміністратар не налажыў яшчэ на той часьці свае рукі. Цяпер-жа ўзьнімаецца сур'ёзная небаспека, што польскі адміністратар, пад уласьць каторага падыходзіць гэная часьць віленшчыны, пастараецца прыпыніць карысную працу каталіцкага духавенства...

Як бы там ні было, мы з радасьцю бачым, што духавенства на правінцыі, апынуўшыся за ме

Каваль і чорт.

Жыў на сьвеце каваль. І напладзіў ён гэтулькі дзяцей, што ня было ім чаго есьці. Ось ён кінуў дзяцей і пашоў прочкі. Ішоў, ішоў, прыходзіць да балота. Як уздумае на дзяцей, дык і заплача. Плакаў, плакаў па дзецях, а тады кажа: „я-б, здаецца, чарту душу запрадаў-бы, каб толькі ён накарміў маіх дзяцей!" Зара выскакуе чорт з балота: сам ясны, вочы чырвоныя, а брыль, як на чарту. „Што ты тут казаў?" — Нічога, панічок, не казаў! — „Не казаў?» — Я казаў, каб хто накарміў дзяцей, я-б таму і душу запрадаў-бы!—„Ну, добра! Расьпішыся, што ты прадаеш мне душу, дык я табе трыдцаць гадоў буду служыць, усё чыста буду робіць, што загадаеш!" Каваль думаў, думаў, дый расьпісаўся. Прыходзіць дамоў, аж у яго ўсяго ё: і хлеб і грошы. Вось каваль і стаў жыць добра. Загадаў ён чэрцям, каб яны пабудавалі яму хату. А яны пабудавалі яму пакоі, ды такія, што над усім сьветам, і абгарадзілі двор высокім тынам. І што толькі каваль загадае, чэрці і робяць. І проста ён іх пазамучаваў. Як разбагацеў каваль, дык паставіў царкву, наняў папа на свой кошт і кожан дзень абедню служыў. Пачуў раз каваль, што пан дужа б'е мужыкоў на прыгоне. Ось ён пазваў таго пана да сябе ў госьці. Прыйшоў пан у госьці да каваля, той, каваль яму і кажа: „што, як-бы ты мне прадаў свой двор?" —А жупі, кажа.—„Колькі-ж табе даць?"—«А насып поўную карэту золата, дык я выбяруся, як стаю!» Каваль загадаў закаціць карэту ў пуню, і чэрці за ноч насыпалі поўную карэту золата. Сеў пан на золата і паехаў і не заехаў ужо і ў свой двор з тымі грашмі. Прызваў каваль мужыкоў гэных. «Ну, кажа, цяперака вы ня будзеце болей прыгону служыць. Толькі дайце мне па залатоўцы ад хаты!" І рады сталі ўсе мужыкі, і кожан дзень яны Богу маліліся за каваля! А каваль ідзе, каго ўбача, вараз накорме, напое і на дарогу дасьць. І тэкі міласьлівы стаў, што траха плакаў, калі каторы дзень ня было ў яго чужога чалавека. А чарцей ён зусім пазамучаваў, ужо й ня рады яны, што зачапілі каваля. Вось канчаецца ўжо трыдцаць гадоў. Пашоў раз каваль на поле і ўбачыў: едуць тры чалавекі, галечы, старыя. Ен да іх і просе іх, каб зайшлі да яго аддыхнулі. Ну, яны зайшлі да яго. Ен іх напаіў, накарміў, учасьціў добранька. Аддыхнулі яны, падзякавалі і зьбіраюцца ісьці ад яго. Тады адзін кажа: ці ведаеш, кажа, хто мы такія? А ён кажа: а Бог вас, кажа, ведае, хто вы такія, добрыя людзі! Тады адзін кажа: Я Бог, кажа. А другі кажа: а я Спас! А трэці кажа: а я Юры! Тады Бог кажа: прасі-ж ты ў нас, чаго ты хочаш, за гэта, што ты нас накарміў! А ён кажа: нічога ж мне, Госпадзі, ня трэба; хіба толькі як прышле чорт пасланца за мной, каб ён ня мінуў ігрушы, што ў мяне ў садзе, ды завесіўся на ёй?—Гэта, кажа Бог, можна... Тады Спас пытаецца: а што-ж мне табе даць?—А як прышле чорт другога пасланца па мяне, дык ці ня можна, каб і той там быў?—Добра! хай так! Тады пытае Юрыя: ну, а з мяне ты чаго хочаш?—Зьмілуйся, сьвяты Юрыя! Як прыйдзе сам чорт па мяне ды сядзе во тут на жуце, дык ці ня можна, каб ён і ня ўстаў? Добра, кажа Юрыя; толькі глядзі, ці крэпка лаўка, а то-ж у яго сіла—чартоўская сіла! Каваль той падзякаваў ім, яны й пашлі. А ён зара прызваў сваіх кавалёў і прыкаваў добра лаўку. Пажыў ён колькі там пасьля таго, аж чорт і прысылае чарцянё: «Ты ўсё бяседы вядзеш ды банкеты, а на нас прызабыў! Прысдаў мяне той чорт, што ты расьпіску даваў. Казаў, каб ты ўжо йшоў!"—Ну што-ж, кажа: ісьці, дык ісьці,—я ўжо сваё аджыў, зьбегай-тку ў сад, прынясі салодкіх ігруш смагу прагнаць нам на дарозе!

жамі ўплываў вышэйшай польскай касьцельнай адміністрацыі, выяўляе зусім справядлівыя адносіны да нашага народу. І мы верым, што ў хуткім часе настане канец польскага палону для каталіцкага касьцёлу на Беларусі, — абы толькі вышэйшая ўласьць у дыэцэзіі перайшла ў рукі праўдзіва каталіцкага біскупа.

Х. Х.

У Вільні і ваколіцах.

× **Аб адкрываньні беларускіх школ.** З розных ваколіц зьвяртаюцца да нас беларускія сяляне з просьбамі памагчы ім адкрыць беларускую школу, каб іх дзеці маглі вучыцца граматы ў сваей роднай мове. Ня маючы магчымасьці ў кожным прыпадку даць раду беспасрэдна, мы падаем да агульнага ведама, што, каб адкрыць у вёсцы беларускую школу, трэба напісаць просьбу да свайго Кэйсгаўптманна, пад каторай павінны падпісацца чым-боль людзей. У просьбе трэба сказаць, што сяляне дадуць патрэбнае памяшчэньне і абязываюцца пасылаць у школу сваіх дзяцей.

Тэкст просьбы павінен быць гэткі:

Пану Крэйсгаўптману...

Мы, ніжэйпадпісаные жыхары вёскі (мястэчка) . . . . просім адкрыць для нас беларускую пачатковую школу. Мы абязываемся даць патрэбнае для школы памяшчэньне і пасылаць уяе нашых дзяцей.

. . . дня . . . . . мес. 1918 г.

Панямецку гэта будзе так:

Wir, endunterzeichnete, Einwohner des Dorfes (des Städtchen) . . . . bitten ergebenst eine weissruthenische Volksschule bei uns einrichten zu wollen. Wir verpflichten uns eine entsprechende Räumlichkeit zu besorgen und unsere Kinder in die Schule zu schicken.

× **«Нямецкіе рублі».** 30 жніўня число «нямецкіх рублёў» у абароце дайшло суммы на 598.527.000 марак.

× **Карты на хлеб жонкам запасных** на месяц кастрычнік будуць выдаваць у Штадтгаўптмана, аддзел III, пакой 143:

для 4	цыркулу	—	9 і 10 вер.
„ 6	„	—	10 і 11 „
„ 7	„	—	11 і 12 „
„ 8	„	—	12 і 13 „
„ 1	„	—	14 „
„ 5	„	—	16 „
„ 3	„	—	17 „
„ 2	„	—	18 і 20 „

× **Прадажа коз.** У мястовай бойні, на Палтаўскай вуліцы, у панядзелак і чацьвер ад 8 да 10 гадз. будуць прадаваць значнае чысло малочных коз.

× **Збор з бітай скаціны.** Штадгаўптман апавяшчае, што за пазваленьне на біцьцё дома і за вэтэрынарны агляд маса будуць браць гэткі падатак: за штуку рагатае скаціну — ад 4 да 8 м., за цяля — ад 1.50 да 2 м., за сьвіньню — ад 3 да 4 м., за аўцу — ад 1 да 2 м., за казу — ад 1 да 2 м., за шынку — 50 фен. і за кусок сала — 30 фэн.

× **З суда.** Ядвіга Астроўская, незамужная, і акушэрка Мар'я Колдрыч за праступак проці зараджэньня новага жыцьця засуджаны на 3 і 6 месяцаў у вастрог.

× **Дзень у верасьні.** 1 верасьня сонца ўзышло ў 6 г. 13 м., зайшло—ў 7 г. 49 м. вечара; 11 верасьня ўзыйдзе ў 6 г. 37 м. і зайдзе ў 7 г. 25 м.; 21 яно ўзыйдзе ў 6 г. 44 м. і зайдзе ў 7 г. 1 м.; 30-га ўзыйдзе ў 6 г. 59 м. і зайдзе ў 6 г. 40 м.

23 верасьня ў 11 гадз. вечара сонца другі раз пяройдзе цераз экватар і войдзе ў групу зорак Вагі. Тады ноч будзе роўна дню, і пачнецца восень.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
5—6	+ 16,8°	+ 10,0°
6—7	+ 18,7°	+ 6,5°
7—8	+ 15,1°	+ 9,0°
8—9	+ 17,8°	+ 5,2°

З усяго Краю.

Будучына Балтыцкіх зямель.

Нямецкія газэты Балтыцкага краю высказываюць сваё здаволеньне з прычыны дадатковай умовы і дамагаюцца хутчэйшага правядзеньня пэрсанальнай уніі с Прусамі, прычым павінны быць прыняты пад увагу жаданьні народу і асаблівыя варункі краю.

Латышская газэта «Baltijas Sinas» піша: «Цяпер, калі з Расеей зроблена угода аб праўным палажэньні, можа быць выказана надзея, што ўнутраны праўны лад будзе ў нас абапёрты на прынцыпе роўнай цэннасьці народаў.

ВІЛЕЙКА. У часе вайны пераважная часьць насяленьня нашага места была выехала. Цяпер яно памалу пачынае варочацца. Уцекачы прыежджаюць з усім сваім дабром. Фабрыка Поссэла пашырае сваю працу. Пасьля доўгай нябытнасьці варочаецца да места і доктар.

ГРОДНЯ. Не пазьней 1 кастрычніка, згодна з загадам Штадгаўптмана с 1 верасьня, павінны быць аддазены ўсе ручныя млынкі, якія ёсьць у людзей.

Сака С. злавілі ў 5 гадз. раніцы лезучы праз вакно ў біскупскі палац, дзе ён маніўся пакрасьці зложаныя тамака акты. Яго аддалі пад суд.

ГРОДНЯ. Тарговец Арон С. закупіў у Пскове партыю палатна і манафактуры і прывёз у Гродню без пазваленьня на пісьме ад гродзенскай уласьці. 25 жніўня ён намыкаўся перавезьці свой тавар у начы цішком у сваю краму, але пры гэтым яго задзяржалі. У яго сконфіскавалі 200 арш. палатна і 200 арш. мануфактуры, за каторыя ён заплаціў 3.000 марак.

Апрыч тайных бравароў у апошнім часе пачынаюць выкрываць і тайныя гарбарні. Гэтак, на Манастырскім завулку сконфіскавалі некалькі бочак з скурамі, намочанымі дзеля вырабу.

ГРОДНЯ. 20 жніўня ў падворку дому № 13 на Індурскай вуліцы арыштаваны 4 вазы з жытам і сольлю, назначаныя для вывазу.

БЕЛАСТОК. З аднаго мястовага прытулку для распусных дзяўчат Лэя С. уцякла да бацькоў у Гродню і забрала галубятнік з 18 галубамі. Гродзенская паліцыя, папярэджаная аб гэтым, арыштавала С. хутка пасьля яе прыезду.

БЕЛАСТОК. У аднэй з тутэйшых гасьцініц і на станцыі задзержаны некалькі звояў сукна, каторае цішком маніліся вывясьці на Украіну. На Баранавіцкім шоссэ арэштаваны шмугляры, памыкаўшыяся вывязьці цішком 10 цэнтнэраў жыта.

БЕЛАСТОЧАК. На Казлоўскай вуліцы зроблена кража з узломам. Зладзеі забралі шмат бялізны.

КАЛІНОУШЧЫНА. Тут укралі с пашы 8-гадовага цёмна-каштанавага каня.

ЛЮБАНЕЦ. Тутэйшы стараста, Пахтэр, згубіў свае паперы, а разам з імі і павязку на руку. Яны аб'яўлены утраціўшымі сілу.

БЯЛЕВА. Камісія, зложаная з амтсфорштэера, жандара, старасты і гаспадара Баламута, раскладаючы між сялянамі дастаўку збожжа ўраду, вызвала сваей раскладкай нездавольства селявіна П., каторы заявіў, што раскладка зроблена несправядліва, і грaзіў пабіць Баламута. Колькі дзён таму назад, сустрэўшы Б., ён пачаў з ім сварыцца і пабіў яго да утраты памяці. Справа пайшла ў суд.

СУВАЛКІ. У той панядзелак тут расстрэляны сяляне Зыгмунт і Бранісłаў Ропялеўскія. Іх засудзілі на сьмерць за забойства 31 жніўня нямецкага салдата.

КОУНА. У апошнім часе, у зьвязку з расейскімі здарэньнямі, відаць узрост сыянізму між нашымі жыдамі. На гэту тэму у той аўторак прачытаў лекцыю прыехаўшый з Кіева студэнт Гарфункель.

ПАНЕМОНЬ. Пераяжджаючы цераз чыгунку параконная брычка з 2-ма нямецкімі афіцэрамі папала пад поезд. Абодва афіцэры забіты.

АЛЯКСАНДРАУКА, Ков. пав. У пятніцу, ў 7 гадз. вечара, патруль сустрэўся ў тутэйшых ваколіцах з бандай аружных разбойнікаў. Узьнялася бітва, ў часе каторай аднаго разбойніка застрэлілі, рэшта ўцякла. Пры забітым знайшлі 9 абойм з расейскімі патронамі. Гэта аказаўся адзін з найбольш небаспечных разбойнікаў, учасьнік чысьленых нападаў с чалавечымі ахвярамі.

ВІЖЭЙНЫ. У Ваўкупі згарэў увесь двор селяніна Адлера з усенькім ураджаем, а такжа 7 парасят.

ТУТАРАУЦЫ. У начы на 22 жніўня вясковая паліцыя злавіла двох супрасьльскіх жыхароў, рэзаўшых калосьсе і выбіваўшых з яго палкай зёрны на посьцілцы. Кожны засуджан на 2 мес. ў вастрог.

ЛІБАВА. У начы на тую нядзелю узьняўся пажар у вясёлым доме «Цэтыньё»; ня гледзячы на ратунак, дом згарэў да тла.

РЫГА. Пазволена свабодна плаваць уздоўж узьбярэжжа на малых суднах. Аднак, с прычыны таго, што ля берагу ёсьць многа мін, плаваць тут яшчэ ня зусім баспечна.

РЫГА. Рыжскія газэты жаляцца, што публіка ўсё яшчэ ня можа адвучыцца ад старой прывычкі пры кожных зносінах з агентамі цяперашняга ўраду «мазаць» іх. Нямецкія ваенныя ўласьці загадалі самымі цяжкімі карамі бароцца проці гэтага, ды паліцыі загадана зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу.

Украіна.

БЭРЛІН. 6 верасьня імпэратар прыняў на аўдыэнцыі гэтмана Скоропадскага і сьнедаў разам з ім.

БЭРЛІН. У часе сьнеданьня ў палацы Вільгэльмсгэ Імпэратар зьвярнуўся да гэтмана Скоропадскага з прамовай, у каторай паміж іншым сказаў:

Чарцянё пабегла. Палезла шчыпаць ігрушы, папала ў вілкі галавой і задавілася! Ждаў, ждаў чорт—няма ні каваля, ні пасланца. Пасылае другое чарцянё. Прыбягае тое: «што вы робіце, нешта вас не даждацца?» — Чаго ты, кажа: я ніякіх тваіх паслоў у вочы ня бачыў!—„Ды прыслаў чорт, каб ты зараз ішоў да яго!“—Ну, добра, пойдзем сабе! Зьбегай-тку хутчэй у сад, пакуль я прыбяруся —вышчыкі з дзесяток яблыкаў на дарогу! Чарцянё пабегла ў сад, палезла на яблыну, дый ушчаміла галаву ў вілкі,—і задавілася. Ждаў-ждаў стары бес, не дождаўся,—бяжыць сам да каваля. Прыбег і крычыць: і пасланцы тут сядзяць, і ты сядзіш! Годзе мне ўжо робіць на цябе! Ты й так ужо жыльля павыцягаў з мяне! Як-жа ня жаль,—поўну карэту золата насыпалі! Я зусім папарваўся, упадаючы каля цябе. Пара і на табе паворываць ды смалу павазіць!.. Раскрычаўся, што хоць з хаты ўцікай! Ледзь яго каваль угаварыў павячэраць з ім на дарогу. Толькі чорт сеў на кут, на лаўку,—так і прыліп! Ось, тады каваль кажа: «Як-жа ж гэта: я пайду, а хата мая яшчэ не пасьвяцана? Трэба ўпярод хату пасьвяціць!» Пазваў зара папа, і сталі малебны правіць. Усе моляцца, а ён сядзіць на куце, вочы палупіўшы. Тады поп кажа: хрысьціся! Ды яго крыжам па лобе! Як ірванецца ён—хацеў уцекці, аж хата задрыжэла. А лаўка не пускае. Пазваў тады каваль дванадцаць кавалёў; прыробілі чарту да боку мех кавальскі і сталі дзьмуць. Награюць яго, ў дванадцаць малатоў давай каваць! Білі-білі, білі білі: а што, ці даруеш кавалю?—Не, кажа, не дарую! Ось яны йзноў давай грэць ды каваць. Білі-білі, білі-білі: а што, ці даруеш? — Усё дарую і яшчэ служыць буду, толькі пусьцеце! Яны лаўку адкавалі, ён і счэз. А каваль стаў жыць, ды пажываць, ды дабра нажываць.

Чэрці на ігрышчы.

У аднэй вёсцы была такая завядзёнка, каб зьбірацца на супрадкі дзеўкам у вадну хату. Раз дванаццаць дзевак сабраліся на сваю кватэру, набралі яец, сала, кілбас — дзела было аб Каляды — і сталі скварыць, каб мальцаў частаваць. Тады ўночы прыходзяць быццам мальцы, прыносяць гарэлку. Дзеўкі тыя, ведама, просяць іх з сабой вячэраць. І ў аднэй дзеўкі дзіцянё было на руках. Яно дзержала лыжку і ўпусьціла. Тая дзеўка палезла пад стол даставаць лыжку і ўвідзела, што ў іх хвасты вісяць. Яна тады устала і хоча ісьці з хаты, а чэрці яе ня пускаюць. Яна кажа: я зара прыду! Вышла і пабегла ў ёўню. Еўня, ёўня, кажа, не аддай мяне! печка, печка, не аддай мяне! ток, ток, не аддай мяне! перагаварыла, што толькі ў дум узышло. Тыя чэрці пад'елі, узялі сабе па дзеўцы і сталі душыць; дык адзінаццацём чэрцям ёсьць па дзеўцы, а дванаццатаму няма. Вось ён пабег за тэй дзеўкай у ёўню. Прыбег у ёўню і стаў дзьверы адчыняць,—не адчыняюцца. Ен і стаў гаварыць: дзьверы, дзьверы, аддайце дзеўку! Яны адчыніліся. Еўня, ёўня, аддай дзеўку! Не аддаець. Печка, печка, аддай дзеўку! Не аддаець. Пакуль ён усё перагаварыў, пятух і запяяў. Ен і ўцёк. А тых адзінаццаць дзевак усіх чыста падушана.

«Мой урад узяўся за ўтварэньне міжнароднай асновы для украінскай дзяржавы, і мае арміі прынялі ўчасьце ў супакоеньні краю, пасьля чаго можа пачацца будаваньне дзяржавы. Мешчанін у будучыне можа спакойна занімацца сваім промыслам, а селянін — ў поўнай баспечнасьці рабіць на зямлі і карыстаць з пладоў свае працы. Няхай прыязныя палітычныя зносіны між Нямеччынай і Украінай разьвіваюпца і ўзмацоўваюцца ўсё болей. Гэтману казакоў гура, гура, гура!»

Гэтман адказаў па ўкраінску, кажучы паміж іншым:

«Словы Вашага Вялічаства адгукнуцца па ўсей Украіне. У цяжкіх муках сучаснае вайны засьвяцілася, як прадвесьнік міра, нацыанальнае пачуцьцё паняволеных народаў. Дзякуючы магутнай помачы Нямеччыны, Украіна здабыла асновы свае дзяржаўнае незалежнасьці. Як гэтман усіх украінцаў, я ад імя ўдзячнага ўкраінскага народу крычу тройчы «hoch!» нямецкаму Імператару».

Пасьля сардэчнага разьвітаньня гэтман выехаў назад.

ОДЭССА (У.Т.А.). У часе апошняга ўзрыву забіты 2 і ранены 18 нямецкіх салдатаў.

С Польшчы.

ВЕНА. 6.IX. У часе перагавораў з нямецкім статс-сэкрэтаром загранічных спраў, ф. Гінцэ, разглядалі і польскае пытаньне. Пры гэтым абодва ўрады згодзіліся і далей вясьці аб ей перагаворы, ня спыняючы іх.

ВАРШАВА. «Monitor Polski» наказывае, што рэгенцкая рада пастанавіла прыняць адстаўку прэм'ер-міністра Стэчкоўскага, каторы цяжка захварэў.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

БЭРЛІН. Паводлуг нямецкіх урадовых ведамасьцей, большэвікі ў Расеі масовых забойств ня робяць. Усе чуткі, якія пускаюць аб гэтым саюзьнікі, нязгодлівы с праўдай. Праўда, што ў часе апошняга паўстаньня ў Пецярбурзе расстрэляны каля 500 асоб. Апошнія пакушэньні, арганізованыя саюзьнікамі, вызвалі расстрэл 20 асоб. З прычыны пакушэньня на Леніна ніхто не пакараны сьмерцю. Тэндэнцыйныя чуткі аб большэвіцкім тэрроры пускаюцца саюзьнікамі з тэй мэтай, каб мець прычэпку ўмяшацца ў расейскія ўнутраныя справы.

МАСКВА. З Ліону прышла іскровая тэлеграма, як відаць, з урадовай крыніцы, у каторай гаворыцца, што Англія і Францыя будуць мсьціцца на большэвіцкіх палітыках, якія знаходзяцца ў іх руках, за ўсё, учыненае проці французскіх і англігкіх падданых у Расеі. Да рэпрэсій саюзьнікаў трэба далічыць і ўсе страшэнствы, якія робяцца ў Расеі чэха-славакамі. Гэтак увесь сьвет можа пазнаць мэты і спосабы англіцкага і французскага імпэрыялізму.

МАСКВА. «Ізвестія» далей наказываюць аб англіцка французскіх інтрыгах проці савецкага ўраду. Быў утвораны фікцыйны латышскі нацыанальны камітэт, з каторым адбываліся нарады аб Латышскай аўтаноміі. Камітэту далі грошы—500.000 руб. Быў зроблен кружок «Раманаўскага ордэру», каторы меў на мэці паварот дынастыі Раманавых.

ЛОНДОН (Рэўтэр). 6.IX. Англіцкі пасол у Пецярбурзе, лёрд Буканэн, заявіў у англіцка-расейскім клюбе ў Лёндоне, што ён спадзяецца, што Расея скора ізноў займець старое месца сярод народаў. Большэвікі ведаюць, што прыходзіць апошні дзень іх панаваньня. Расея просіць помачы. Гэту помач павінны даць саюзьнікі. Цяперашні мір між Нямеччынай і Расеей для саюзьнікаў раўназначны самагубству».

ГААГА. Англіцкае ўрадовае апавяшчэньне аб обыеку ў англіцкім пасольстве ў Расеі называе яго „большэвіцкім рабункам". Расейскаму паслу пададзена трэбаваньне здаволеньня Англіі і пакараньня вінаватых. Інача Англія будзе лічыць адказываючымі за гэта членаў савецкага ўраду і пастараецца дабіцца прызнаньня іх цывілізованымі народамі вынятымі с-пад апекі закона.

МАСКВА. Троцкі на засяданьні спаўняючага камітэту здаваў справу аб ваенным палажэньні. Ен дамагаўся концэнтрацыі ваенных чыннасьцей у руках ваеннай рады. Савецкая Расея павінна быць абернена ў ваенны табор.

БЭРЛІН. Абшар, прыслухаючый цяпер савецкаму ўраду, мае гэткія межы: на заходзе—лінія Нарвы, Пскова, Оршы, Белгорада, адтуль — да Волгі і церав Царыцын да Каўказу; на ўсходзе — лінія ад Пэроўска, на Каспійскім моры, да ўсьця Урала, пасьля да Сімбірска, Казані і Пермі, якія, аднак, знаходзяцца ў варожых руках; паўночная граніца йдзе ад Урала да Пецярбурга. Апрыч таго савецкія войскі стаяць яшчэ ў Туркестане, ў Сібіры ад Томска да Манджурыі і на Уссурыйскай чыгунцы.

На ўвесь гэты абшар нападаюць ворагі. На поўначы, на Мурмане, стаіць каля 20.000 англічан, французаў, амэрыканцаў і сэрбаў, а такжа ад 6 да 7 тысяч расейцаў і фінаў; яны пранiклі да Онежскага возера і йдуць на Петрозаводск. Зышоўшыя ў Архангельску англічане йдуць на палудзень і палудзенны ўсход. На Мурманскім узьбярэжжы і ў Белым моры стаіць саюзьніцкі флот. У Донскай обласьці стаяць казакі генэрала Краснова і дабравольцы Дэнікіна. Грузіны сабраліся ў ваколіцах Тыфлісу. Горныя плямёны паднялі паўстаньне. У Баку знаходзяцца армяне і англічане, каторыя йдуць на Петроўск. На ўсходзе ад Большэвізіі стаяць чэха-славакі і казакі. У Туркестане Красназаводск заняты англічанамі. У Уссурі, паводлуг апошніх вестак, японцы ўдачна пасоўваюцца ўпярод.

МАСКВА. «Праўда» наказывае, што «бабка расейскай рэвалюцыі», Брэшко-Брэшкоўская, завязала зносіны з амэрыканскімі мільярдэрамі, каторыя згодзіліся даць 120 мільёнаў на арганізацыю расейскага установчага Сэйму.

Савецкі ўрад загадаў арыштаваць усіх англіцкіх і французскіх падданых ад 18 да 40 гадоў.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньні.

6.IX. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: Між Клюкспэрт і Армантьер адбіты чысленыя атакі ворагаў. Узяты 100 палонных. Пры Гулюш — удачнае наступленьне на варожые акопы. Ля дарогі Бапом — Камбрэ, ў лесе Аврэнкур і на гарах на ўсходзе ад Тортій адбыліся вострыя пяхотныя бітвы. Атакі ворагаў на лініі Нэвіль — Марнанкур — Муэн — Лен адбіты. Між Сомм і Уаз і між Уаз і Эн нашы опэрацыі адбываліся плянова без пращкод са стараны ворагаў.

Фронт нямецкага Насьледніка: На ўсходзе ад Суассон ворагі прайшлі церав Вэль. На вяршынах пры Фім мы адбілі сільные атакі амэрыканцаў.

7.IX. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генэрал ан-шэфа ф. Бэн'а: Пры Лянгмарк мы ўзялі больш за 100 палонных. Каля Іпра мы адбілі чысьлевыя атакі англічан. Нашы ар'ергарды прымусілі ворагаў атакаваць іх на лініі Фэн—Лірмон—Лётавэн. Нашы лятуны атакавалі варожыя войскі, пераходзючыя церав Сомму пры Брі і Ст. Крiст. Ворагі прайшлі церав Гам і Соні і ў вечары стаялі на лініі Огэні—Віль Вье—Омон, б'ючыся з нашымі ар'ергардамі. Наабапал Вогсэйён адбіты сільныя варожыя атакі.

Фронт нямецкага Насьледніка: На ўсходзі ад Вайі мы сустрэліся з ворагамі. На гарах ля Фім мы ізноў адбілі атакі амэрыканцаў.

8.XI. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: На ўсходзе ад Мэркэм мы ўзялі ў палон бэльгійцаў. На поўначы ад Армант'ер адбіты атакі англічан. Мы ўсюды стаім на нашых пазыцыях. На заходзе ад лініі Гурокур — Тампле адбіты вострыя атакі ворагаў. Наабапал Соммы мы стаім на лініі Вэрман—Ст. Сімон—канал Кроза. На поўначы ад Эн артылерыйская бітва ўзмацавалася. На заходзе ад лініі Брэмон — Баранкур адбіты сільныя мясцовыя атакі ворагаў. На паўдня ад Воксэйён ворагі нашчупываюць нашы новые пазыцыі. Сільныя атакі між Воксейён і на заходзе ад Вайі, паўтораныя некалькі разоў, адбіты.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ЖЭНЕВА. На першым засяданьні французкага парляманту Клемансо паміж іншым заявіў:

«Мы і нашы саюзьнікі дабіваемся пабеды чалавекалюбства і будзем бароцца датуль, пакуль не разарвуцца путы няволі і ня будзе створана новая справядлівасьць і новая воля».

БЭРЛІН. Карэспандэнту аднэй вэнгерскай газэты Людэндорф у вялікай глаўнай кватэры сказаў:


«Вострую барацьбу мы дагэтуль выдзержывалі с чэсьцю і пераконаны, што датрываем гэтакжа да канца. Амэрыканцы ўжо прыехалі і аказываюць значную помач людзьмі і матэр'яламі. Але прыпісываньне ім рашучага ўплыву на канец вайны—гэта пустая надзея саюзьнікаў. Мы дамо раду і з амэрыканцамі. Наша воля дайсьці пабеды—нязьменная».

ВЕНА (В.Т.Б.). У гутарцы з адным членам аўстрыяцкага парляманту гр. Бур'ян заявіў, што новае непрыхільнае становішча ў нязанятых цэнтральнымі дзяржавамі часьцёх Румыніі зьвяртае на сябе пільную ўвагу цэнтральных дзяржаў, і ў патрэбе будуць учынены самыя становучыя крокі.

БЭРЛІН. (В.Т.А.). 6.IX. Нашы падводныя лодкі ў Сяродземным моры затапілі 13.000 тонн.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 7.IX. Ля англіцкіх і французскіх берагоў мы затапілі 12.000 тонн.

БЭРЛІН. 8.IX. У поясе блокады навакол Англіі мы затапілі 11.000 тонн.



Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.